№ 78 (1143)
Субота, 28 красавіка 2001 г.
Выдаецца з ліпеня 1995 г.
на беларускай і рускай мовах
Перыядычнасць —
5 разоў у тыдзень
Кошт: у кіёсках і крамах — 100 руб., у індывідуальных гандляроў — свабодны.

На прастор, на шырокі разлог
Выхадзі, мой народ, грамадою...
Якуб Колас

Народная Воля

Кальченко & К°
Освітлювальне обладнання, лампи, кабель
8-(017)-213-70-21
8-(017)-213-70-13

У сувязі з выхаднымі і святочнымі днямі наступны нумар "Народнай волі" прыйдзе да чытача ў чацвер 3 мая.

Пейджинговую связь редакции обеспечивает
МОБИЛКОМ
пейджинг-система
(017) 222-46-51
(017) 222-46-52

БАЛІЦЬ ЧАРНОБЫЛЬСКАЯ РАНА

На "Чарнобыльскім шляху" міліцыя адпачывала

На плошчы Свабоды спачатку сабралося вельмі мала для такой значнай акцыі народу. Магчыма, людзі проста не ведалі, куды ісці, бо да апошняга моманту дакладнай інфармацыі наконт правядзення "Чарнобыльскага шляху" не было. Адсутнічалі ўлёткі ў паштовых скрынях, наклейкі ў грамадскім транспарце, раскіданыя запрашэнні ў шматлюдных месцах горада.

Складвалася ўражанне, што нават тыя, хто ўсё ж такі прыйшоў на плошчу, не ведалі, што рабіць. Прыкладна каля гадзіны ў незразумелым чаканні людзі самотна тапталіся ў скверыку. Супрацоўнікі спецслужбаў у цывільным ёрнічалі: з дзвюх тысяч сабраўшыхся паўтары тысячы нашых. Прыбліжоныя да міністра ўнутраных спраў асобы паведамілі: маўляў, можаце гуляць, дзе заўгодна, міліцыя сёння адпачывае.

І на самай справе адбыўся цуд. На вуліцах Мінска практычна не было міліцыі. Па ўсім маршруце ў прылягаючых дворыках не стаялі аўтобусы з курсантамі міліцэйскай Акадэміі, амапаўцамі, салдатамі, як гэта заўжды бывае ў тыя дні, калі апазіцыя ладзіць свае мерапрыемствы. Афіцыйную прысутнасць ахоўнікі правапарадку пацвердзілі, калі да сквера пад'ехала службовая "Волга", з якой пераканаўча папрасілі *"не парушаць грамадскі парадак і правіла правядзення масавых мерапрыемстваў"*. Улады забаранілі праводзіць мітынг на плошчы Свабоды і, як заўсёды, прапанавалі апазіцыі ісці на плошчу Бангалор.

Але на "сабачую пляцоўку" народ не пайшоў. Людзі, не замінаючы дарожнаму руху, арганізавана рушылі па праспекце Скарыны. На прыступках ля Акадэміі навук адбыўся кароткі мітынг. Між іншым, чаму б Мінгарвыканкаму не кінуць сваю старую звычку і не дазволіць апазіцыі праводзіць мітынгі менавіта тут. Амаль цэнтр горада, пляцоўка добрая, месца хапае і ад рэзідэнцыі А.Лукашэнкі далёка.

На паўтадзіны пазней каля Галоўпаштамта на свой "Чарнобыльскі шлях" збіраліся прыхільнікі Кансерватыўна-Хрысціянскай партыі — БНФ, якой кіруе Зянон Пазьняк. Прыйшло ўсяго некалькі дзесяткаў чалавек... Нават у такі дзень апазіцыя не змагла дасягнуць паразумення і згоды. Чым, верагодна, у чарговы раз вельмі парадавала ўлады.

Беларускае тэлебачанне ў сваім рэпартажы з "Чарнобыльскага шляху" сканцэнтравала ўвагу на дзецюках, якія былі апрануты ва ўсё чорнае і па-фашысцку ўскідвалі рукі. Пытанне да арганізатараў: навошта даваць повад для чарговых здзеквў і крытычных заўваг розным казіяткам і зімоўскім? Калі гэта сапраўды "Чарнобыльскі шлях", усё павінна адбывацца менавіта ў рамках гэтай тэматыкі.

Дарэчы, прыкладна семдзесят працэнтаў з тых, хто выйшаў на "Шлях", была моладзь. Юнакі і дзяўчаты запальвалі памінальныя свечкі, званілі ў званочкі, размахвалі бел-чырвона-белымі сцягамі. У першых радах калоны ішлі тыя, хто будзе адраджаць Беларусь. Ім па трынаццаць—чатырнаццаць год. Але пакуль яны вырастуць, Лукашэнка састарыцца...

Марына КОКТЫШ,
Марыя ЭЙСМАНТ.

Заява Амбасады ЗША з нагоды 15-й гадавіны чарнобыльскай катастрофы

У пятнаццатую гадавіну катастрофы на Чарнобыльскай атамнай электрастанцыі Амбасада Злучаных Штатаў далучаецца да ўшанавання ахвяраў Чарнобыля і памятае ад тым велізарным, доўгатэрміновым уроне, што нанесла гэтая катастрофа Беларусі і яе грамадзянам. Гэта была трагедыя, наступствы і ліквідацыя якой не ведаюць межаў.

На працягу апошніх пятнаццаці год урад Злучаных Штатаў і шэраг амерыканскіх няўрадавых арганізацый аказвалі актыўную падтрымку аздараўленню беларусаў і агульнаму выпраўленню сітуацыі на Беларусі. У мінулым годзе Злучаныя Штаты прадаставілі Беларусі гуманітарнай дапамогі больш чым на 15 мільёнаў долараў. Кожны год такія амерыканскія арганізацыі, як "Сіцікхоўп" і Амерыканскі альянс "Дзеці Чарнобыля" дасылаюць гуманітарную дапамогу і валанцёраў на Беларусь і адпраўляюць тысячы дзяцей з забруджаных тэрыторый на лячэнне ў Злучаныя Штаты. Урад ЗША зараз завяршае рэканструкцыю шпіталя ў Гомелі, якая каштуе 450 тысяч долараў, і будзе і надалей імкнуцца ўдзельнічаць у іншых праектах па дапамозе Беларусі ў пераадоленні наступстваў катастрофы. Мы ўпэўнены, што калі беларуская эканоміка будзе стаяць на моцнай рынкавай аснове, беларускія ўлады будуць здольныя рэгулярна выдаткоўваць больш рэсурсаў на гэтыя мэты.

НАДВОР'Е

Сёння ўдзень па краіне захаваецца воблачнае з проясневаннямі надвор'е, пераважна без ападкаў. Вецер слабы. Тэмпература паветра ў Віцебску — +12...+14, Магілёве — +13...+15, Мінску, Гродне — +14...+16, Брэсце, Гомелі — +15...+17.

У наступныя двое сутак пераважна без ападкаў, толькі 30-га па паўночным захадзе кароткачасовыя дажджы. Вецер паўднёвы, слабы. Тэмпература паветра ўначы — +6...+11, удзень — +16...+21, месцамі да +23.

Якім чакаецца пачатак мая?

Сінаптыкі гавораць, што ў выхадныя нас чакаюць цёплыя і сонечныя дні. Тэмпература паветра складзе ўначы 6—10 градусаў цяпла, а днём — 18—23 градусы. Такое надвор'е захаваецца да 3—4 мая. А з 5 мая пачне наступаць вільготнае паветра з Атлантыкі, і ў Беларусі пройдуць сапраўдныя майскія дажджы.

Фота IREX/ProMedia.

ГАЛАСЫ З КАЛОНЫ

Не пагаснуць зоркі ў небе

Самае, бадай, цікавае на любой грамадзянскай акцыі — аб чым думаюць так званыя простыя ўдзельнікі.

Што прывяло Вас на "Чарнобыльскі шлях-2001"? На гэтае пытанне "Народнай волі" адказваюць:

Міхась АНТОНІК, авіядыспетчар аэрапорта "Мінск-2":

— Бачу, вы пазнаёміліся ўжо з маёй жонкай Вольгай і трохгадовым сынком Артурам. Я іх вельмі люблю і хачу засланіць ад усіх бедаў. А вось нашу мілую дачушку-весялушку — гэта ж партрэт я трымаю ў руках — ураставаць не ўдалося... Чарнобыль адабраў яе. І мой маральны доўг — выказаць пратэст супраць безабароннасці ні ў чым не вінаватых ахвяр катастрофы, асабліва дзетак, загінуўшых без пары.

Тамара БАРТАШЭВІЧ, пенсіянерка:

— Чарнобыль — не толькі ў чарнобыльскай зоне, ён — ва ўсім нашым жыцці. Ці не праўда? Людзі бядуюць, мучаюцца і памираюць — адно за адным. Як з такім змірыцца?! Я 35 год адпрацавала на вытворчасці, а пенсія — курам на смех: ні на хлеб, ні на лекі не хапае. Соромна прызнацца, што на спрасці год даводзіцца збіраць пустыя бутэлькі... Але хай лепш будзе соромна тым, хто давёў нас да такога.

Сяргей, навучэнец беларускай гімназіі №4 г.Мінска:

— Я тут не адзін, а з сябрамі. Нам па трынаццаць, мы нарадзіліся ўжо ў чарнобыльскую эру. Шкада, што ад настаўнікаў не многа чулі аб гэтай жудаснай катастрофе. А забудзем пра яе, дык яна можа паўтарыцца, яшчэ і ў страшнейшым варыянце. Не, не і не! Нам трэба вырасці і зрабіць нешта добрае для сябе і Беларусі.

Надзея ДЗЕМІДОВІЧ, былая вязніца ГУЛАГа:

— Памятаю, як у далёкім 56-м вярталася з Тайшэцкага лагера і ўсю дарогу аж да Урала (а гэта тысячы кіламетраў) бачыла з акенца вагона ўзлоўж чыгункі адно і тое ж, добра знаёмае: калючы дрот, начныя агеньчыкі на вартавых вышках. Здавалася, уся савецкая краіна — суцэльны лагер... Цяпер жа за "калючкай" — зона адсялення, ладная частка беларускай зямлі — ахвяры злачынных бездапаказнасці кіраўнікоў той, ужо зніклай дзяржавы. Але ў нас яшчэ пакуль свой дом, і мы не аддадзім яго нікому, адродзім наноў. І я шчаслівая, што жыву на сваёй зямельцы, і спадзяюся, што для яс настануць лепшыя часы. Чуеце, пяюць?

Не пагаснуць зоркі ў небе,
Покуль небо будзе.
Не загіне край забраны,
Покуль будуць людзі...

Святлана КЛІМЕНЦЕНКА.

"Адкрывайце ў сабе мужнасць..."

Джэрэт прэзідэнта Беларусі № 8 "Аб некаторых захадах па ўдасканальванні парадку атрымання і выкарыстання замежнай бязвыплатнай дапамогі" "практычна забаранае хуткую і эфектыўную гуманітарную дапамогу для жыхароў рэгіёнаў, пацярпелых ад Чарнобыля". Такое сцвярджэнне змяшчаецца ў рэзалюцыі V міжнароднага кангрэса "Свет пасля Чарнобыля", распаўсюджанай у сувязі з 15-й гадавінай аварыі на Чарнобыльскай АЭС.

Гэты буйны грамадскі форум праходзіў у Мінску. На ім прысутнічалі больш за 300 чалавек з 15 краін. Сярод удзельнікаў кангрэса былі жыхары забруджаных радыяцыяй раёнаў Беларусі, вучоныя, урачы, парламентарыі, святары і актывісты чарнобыльскіх ініцыятыў.

У прынятай імі рэзалюцыі адзначаецца, што праз 15 гадоў карціна чарнобыльскай катастрофы праяўляецца яшчэ дакладней, а вырашэнне "ўсё ўзрастаючых сацыяльных, гуманітарных і палітычных праблем" патрабуе ўсеагульнай салідарнасці.

У гэтай сувязі ўдзельнікі кангрэса заклікаюць прадстаўнікоў МАГАТЭ не ўтойваць вынікі навуковых даследаванняў, атрыманыя Сусветнай арганізацыяй аховы здароўя (СААЗ), "адкрыта, сумленна і поўна інфармаваць грамадскасць аб небяспеках атамнай энергіі і наступствах катастрофы на ЧАЭС". Урачы і спецыялісты СААЗ, якія даследуюць наступствы радыяцыйнай катастрофы, адзначаецца ў рэзалюцыі, павінны мець магчымасць бесперашкодна рабіць паведамленні аб выніках навуковых даследаванняў. Удзельнікі кангрэса заклікаюць МАГАТЭ змяніць першы артыкул дагавора Міжнароднага агенцтва па атамнай энергіі, заключанага з СААЗ у 1959 годзе. "Абедзве гэтыя арганізацыі павінны мець права даваць грамадскасці інфармацыю аб выніках іх працы, не пытаючыся адзін у аднаго згоды на гэта", — падкрэсліваецца ў рэзалюцыі кангрэса.

У рэзалюцыі змяшчаецца зварот да афіцыйных структур Беларусі з заклікам "зрабіць усё магчымае для пераадолення геаграфічных і палітычных межаў, каб дапамога ад чалавека да чалавека знайшла кароткі шлях". Ад улад, у прыватнасці, патрабуюць спрасціць памежныя працэдуры, знізіць мытныя пошліны на гуманітарныя грузы, паскорыць афармленне іх праходжання цераз мяжу і гарантаваць неадкладную дастаўку гуманітарнай дапамогі атрымальнікам.

Напрыканцы рэзалюцыі кангрэса гаворыцца: "Не дазваляйце адчаю і безвыходнасці пасяліцца ў вашых душах, адкрыйце ў сабе мужнасць, сілу і салідарнасць. Каб супрацьдзейнічаць забыццю, нам неабходны дух новага мыслення і такія дзеянні, якія накіраваны на стварэнне супольнасці, дзе галоўным прынцыпам будзе зацвярджэнне правоў чалавека, міру, справядлівасці, дэмакратыі і захавання ўсяго, што створана Творцам".

Марат ГАРАВЫ.

ДЭМАКРАТЫЯ ПА-БЕЛАРУСКУ

"Зубры" ставяць дыягназ

Суды над удзельнікамі акцыі "Канчатковы дыягназ", прысвечанай дням псіхічнага здароўя, адбыліся 25 красавіка ў Партызанскім судзе Мінска. Як ужо паведамлялася, гэтая акцыя прайшла ў мінулую суботу ў парку імя Горкага. Праз судовы канвеер пад кіраўніцтвам суддзяў Трубнікава і Дзямніцкай было прапушчана больш за 30 актывістаў маладзёвага руху "Зубр".

Нагадаем, што 21 красавіка пры галоўным уваходзе ў парку імя Горкага сабралося каля дзвюх тысяч чалавек. Маладыя людзі актыўна раздавалі прысутным разнастайную прадукцыю: газету "Зубр", відэакасеты, значкі "Мне вядома, хто самы галоўны дурань у краіне", спецвыпуск газеты "Наша свабода", прысвечаны стану псіхічнага здароўя А.Лукашэнкі, наклейкі-стыкерсы.

Студэнты апраналі маскі з выявай лысага вусатага чалавека і белыя халаты. Пачалі разварочваць конкурсы: "Крык-4" (на лепшы крык, які робяць уначы дыктатары), "Дыягностыка" (чарга вусатых людзей стаяла да доктаркі з мэтай праверкі псіхічнага здароўя), настольны хакей (людзі ў масках з азартам спрабавалі выйграць адзін у аднаго).

Пры гэтым усе "героі" з вусамі размаўлялі толькі вядомымі фразамі з набору ўладнай асобы кшталту "гдзе нармальныя чалавечаскія яйца" ці "я не люблю Амерыку". Людзей абсалютна бясплатна фатаграфавалі на фоне скручанага ў супакойную кашулю мазаічнага псіхапата з вусамі, які час ад часу спрабаваў вырвацца і, кульгаючы, збегчы, але здаравенны санітар вяртаў яго на месца, і той у скрусе ад няўдалага ўцёку завываў старую песню "Чорны воран".

Затым з'явіліся лыжнікі ў масках з вусамі, якія з лямантам прабеглі праз увесь паркавы пляц і рынуліся... у ваду Свіслачы. Перайшоўшы рэчку, яны дабраліся да іншага берага, дзе іх ужо чакалі людзі ў штацкім.

Затрыманні адбываліся на працягу ўсёй акцыі, было затрымана 38 чалавек. Падчас затрымання юнакоў збівалі. Лейтэнант міліцыі Бандарчук звяліў з ног Дар'ю Раткевіч і працягнуў яе некалькі метраў па асфальце. А ўжо ў пастарунку лейтэнант Новікаў так штурхнуў Кацярыну Шабан, што яна стукнулася галавой аб сцяну. Дзяўчына была дастаўлена ў шпіталь на "хуткай дапамозе", дзе ёй быў пастаўлены дыягназ "страсенне мазгоў". Сярод затрыманых былі дзве пенсіянеркі, якія гулялі ў гэты час у парку. 16 затрыманых былі дастаўлены ў спецпрымальнік-размеркавальнік на вуліцы Акрэсціна, астатніх вызвалілі да суда.

З панядзелка каля сцен спецпрыёмніка свабодныя "зубры" правялі шэраг акцый у падтрымку зніклых. Спачатку санітар прывёў яшчэ аднаго вусатага чалавека, і той пачаў крычаць: "Я настаяшчы прэзідэнт! Мяняйце мяне на пянастаяшчых, што сядзяць зараз!". Калі на далягляДзе замаячылі міліцэйскія патрулі, "вусаты" збег. Затым яшчэ тры разы на працягу двух дзён невядомыя аднекуль крычалі ў мегафон: "Зубры! Трымайцеся! Мы чакаем вас! Мы верым у вас! Мы памятаем аб вас! Рэжым адкажа за свае злачынствы!..".

З самай раніцы 25 красавіка ля будынка суда Партызанскага раёна пачалі збірацца "зубры", каб падтрымаць сваіх сяброў. 16 чалавек былі дастаўлены са спецпрыёмніка ў "аўтазаке". Некаторыя з іх правялі ў цеснай і душнай жалезнай каробцы ўвесь дзень, чакаючы судоў, якія ішлі неспыняючымся патокам. Аднак маладыя людзі не падалі духам і бавілі час, спяваючы патрыятычныя песні і тапоччуны нагамі.

62-гадовай пенсіянерцы Святлане Данілавай такое правядзенне часу не было так жа прыемна, як юнакам, аднак суд над ёй адбыўся толькі ўвечары. Суправаджаючыя міліцыянты адмовіліся адчыніць дзверы, нават калі бачылі, што жанчыне становіцца млосна. Як высветлілася пазней, такія адносіны да пенсіянеркі тлумачацца тым, што падчас затрымання ў яе былі адабраны бутэлькі. Сёння збіранне бутэлек — адзіны сродак выжывання для многіх пенсіянераў нашай краіны, але пільныя супрацоўнікі міліцыі, якія нават у дзень псіхічнага здароўя хварэюць на параною, палічылі, што пенсіянерка падносіла "снарады" на выпадак хваляванняў.

Усіх "зуброў" абвінавачвалі ў парушэнні часткі 1 артыкула 167 КаАП, па якой ім пагражала да пятнаццаці сутак арышту. Сведкамі выступалі міліцыянты. Задзейнічаны былі таксама доблесныя лейтэнанты Зміцер Бандарчук і Уладзімір Новікаў, якія праявілі геройства, збіваючы дзяўчат, аднак сваёй пагарды да іх не хавалі нават калегі.

Міліцыянты ўвесь час блыталіся ў паказаннях, не маглі вызначыцца, ці з'яўляюцца лозунгі кшталту: "Долой дурака!" ці "Скажем дураку нет!" палітычнымі. Аднак, відаць, суду была спушчана дырэктыва "зверху", таму не было вынесена ніводнага апраўдальнага прыгавору. Суцяшае тое, што ўсем юнакам былі вынесены папярэджанні, а да трох сутак арышту былі прыгавораны толькі тыя, хто ўжо іх адбыў, таму ўсе "зубры" выйшлі на свабоду. Дваіх юнакоў, якія скокнулі з лыжамі ў Свіслач, прыгаварылі да штрафу ў 20 мінімальных заробкаў. Гэтыя штрафы будуць аплачаны праваабарончым цэнтрам "Вясна".

Спіс асуджаных за народныя гулянні ў Дзень псіхічнага здароўя:

Тоўсцік Ірына — трое сутак арышту,
Раткевіч Дар'я — трое сутак арышту,
Драздоў Уладзімір — трое сутак арышту,
Ахадаў Намік — трое сутак арышту,
Канстанцінаў Андрэй — трое сутак арышту,
Сцешык Яраслаў — трое сутак арышту,
Кірповіч Раман — трое сутак арышту,
Богдан Аляксандр — трое сутак арышту,
Арцюшкевіч Дзяніс — штраф у памеры 20 мін. заробкаў,
Сяляўка Антон — штраф у памеры 20 мін. заробкаў,
Садоўскі Пятро — папярэджанне,
Бурая Вольга — папярэджанне,
Чэрнік Наста — папярэджанне,
Кучко Таццяна — папярэджанне,
Апранця Алесь — папярэджанне,
Фідэльман Кірыл — папярэджанне,
Струй Віталь — папярэджанне,
Шабан Кацярына — папярэджанне,
Іваненка Зьміцер — папярэджанне,
Данілава Святлана — папярэджанне,
Паўлючэнка Ірына — папярэджанне,
Крыўко Андрэй — папярэджанне,
Марозава Таццяна — папярэджанне,
П'яных Сяргей — суд перанесены на 3.05.01 г. на 10.00,
Жэрбін Валеры — суд перанесены на 7.05.01 г.,
Афнагель Яўген — суд перанесены на 7.05.01 г. на 11.00.

(Курсівам выдзеленыя асобы, якія знаходзіліся з вечара суботы па вечар серады за кратамі спецпрымальніка-размеркавальніка на вуліцы Акрэсціна.)

Алег БЕБЕНІН.

ОСТРЫЙ ВЗГЛЯД

Путь утомленных

Вячеслав ОРГИШ, доктор философских наук

Когда садился писать этот материал, по привычке включил телевизор. Канал НТВ начинал крутить фильм "Игры патриотов". Не знаю, о чем эта лента, не было времени, чтобы посмотреть. Но название ее эхом отозвалось в размышлениях о политическом мероприятии, которое организовала белорусская оппозиция в день 15-й годовщины чернобыльской трагедии.

Пройдут многие десятилетия, прежде чем наша страна, уняв боль и изжив обширные радиоактивные ожоги, станет воспринимать эту катастрофу как прошлую историю, как летописный факт. Сегодня эту чудовищную рану невозможно зарубцевать при помощи одних материальных средств, тем более что государство выделяет их крайне скудно и нерегулярно.

Пострадало не только тело, но и душа народа. Лучшим лекарством для последней является правда. О виновниках трагедии и тех, кто наследовал их традиции, нравственную и политическую культуру, то есть о нынешнем белорусском режиме. Оглашать эту правду, превращать ее в набат, который не дает молчать совести и побуждает к бдительности, призвана оппозиция. Лицемерие и формализм власти преодолеваются неподдельным переживанием и состраданием тех, у кого душа от рождения патриотка, для кого "жила бы страна родная" — сладчайшая из мелодий.

Помните, еще в середине 90-х, когда 26 апреля оппозиционные партии выводили на уличное шествие десятки тысяч людей, Беларусь превращалась в единый хор, исполнявший реквием жертвам Чернобыля. И власть трепетала потому, что правда о ней, изреченная в порыве всеобщего трагического негодования, была пострашнее любых политических интриг, опаснее самых изощренных планов оппозиции. Белорусский режим приводил в действие все свои силовые и пропагандистские ресурсы, чтобы нейтрализовать идейный и нравственный урон, который он нес в результате массовых акций белорусских патриотов в день чернобыльской годовщины.

На этот раз состоялся *необычный* Чернобыльский шлях. В этом предложении ключевое слово "необычный". Минчане стали свидетелями рядовой политической акции, которая, увы, лишь формально и схематически напоминала аналогичные акции прошлых лет. Уровень предварительной подготовки мероприятия его организаторами был заметно ниже уровня подготовки к нему генерала Наумова и его гвардейцев. Сравнительно малая численность собравшихся даже стала предметом саркастических разговоров переодетых в штатское работников спецслужб. Пожалуй, демонстрантов тысячи три наберется, если считать полторы тысячи наших людей, заметил один из них. Впрочем, МВД эту цифру скорректировало, определив число собравшихся в две с половиной тысячи.

Вместо борьбы патриотов как смысла их жизни мы увидели игры патриотов. По настроению примерно такие, какие видим на футбольном поле или сценических подмостках, когда футболисты или актеры играют очередной спектакль. Играют профессионально, но с оскоминой и усталостью, по необходимости отрабатывая талоны на питание.

Как говорится, есть над чем задуматься.

Площадь "Свободы" видела разные политические собрания, на ней сходилось когда больше, когда меньше митингующих. Но, вероятно, еще никогда не случалось такого, чтобы собравшиеся на политическую акцию люди обнаруживали уныние и какую-то непривычную робость. Даже молодые люди 15—17 лет, которым свойственна импульсивность и нетерпение, выглядели притихшими и слегка растерянными.

Присмотревшись, можно было понять: организационная душа мероприятия до площади не дошла. Нельзя сказать, что организаторов не было совсем. Были. Но были как-то неприметно и, главное, без всякого куража. Оттого, по-видимому, и рядовые митингующие в полной мере не ощущали воодушевления. Там-сям изредка мелькали фигуры видных политических деятелей. Но они вели себя так, словно им дела нет до происходящего, будто их привлекло к событию чистое любопытство. Многие и вовсе отсутствовали. Пожалуй, заметен был один Вячеслав Сивчик — секретарь управы БНФ "Адраджэньне". Он одиноко и деловито исполнял роль представителя от заявителей акции.

Шествие по проспекту Скорины до Академии наук было таким же тусклым и эмоционально вялым, каким было стояние на площади Свободы. Выкрикивали привычные лозунги, клеймили позором режим, требовали к ответственности тех, кто организует в стране политический Чернобыль. Впереди колонны шла группа молодых людей в униформе, которые своим видом должны были демонстрировать решительность и силу оппозиции.

Однако их жесты и реплики были не очень убедительны. Гораздо убедительнее было бы нахождение во главе колонны известных деятелей науки, культуры, производства. Но их не было. Не возглавили колонну будущие кандидаты в президенты (не могу сказать, присутствовали ли они вообще). Не пошли впереди демонстрантов и ведущие политики от оппозиции. Последние то ли посчитали ниже своего достоинства стать впереди, то ли убоялись милицейско-омоновских "наездов" и предпочли добираться к приступкам Президиума Академии наук окольными путями. Воистину, набрались мудрости.

И были посрамлены. Милиция исчезла. На всем протяжении шествия и во время митинга в пределах видимости ее просто не было. Пиаровский ход "Красного дома" удался. Телевизионную картинку-отчет об оппозиционной акции казенные толмачи, надо думать, будут долго сопровождать комментарием о том, что в Беларуси с демократией все-де обстоит наилучшим образом, поскольку даже несанкционированные митинги проходят в отсутствие милиции.

Что же случилось? Почему в связи с прошедшим о мероприятии, которое начиналось скромным собранием на площади Свободы и закончилось скромным митингом у белорусского храма науки, подмывает сказать: "Господа, это кризис жанра?"

Когда я наблюдал и оценивал работу организаторов "шляха", у меня в голове неотступно вертелась строчка из песни Булата Окуджавы: "Мой конь притомился, стоптались мои башмаки...". У всего есть свой ресурс. Самые прочные вещи, в конце концов, теряют свои лучшие свойства. Даже металл становится усталым.

Белорусская оппозиция притомилась. В действиях демократических сил ощущается усталость. Дело не только в не слишком удавшемся чернобыльском мероприятии. Последние полтора года картина политической жизни с участием оппозиционных партий и движений все более отчетливо напоминает зрелище уныло бредущих вдоль берега бурлаков. Оппозиционеры стонут и бранятся между собой, но при этом вполне покорно топают привычным маршрутом. Их действия становятся все более предсказуемыми, и нынешнему режиму все проще с ними управляться. Демонстративное "исчезновение" милиции во время нынешнего "шляха" — красноречивое тому подтверждение.

Обычная практика, когда притомившиеся, отслужившие свой срок работники уходят на пенсию, а на их место заступают молодые, со свежими идеями и воображением люди. Без ротации кадров не может быть развития в деле. Сегодня рассчитывать на второе дыхание оппозиции, не наполняя ее свежей кровью, не приходится. Понять это особенно важно в канун президентских выборов.

Отрадно, что "Чарнобыльскі шлях-2001" большей частью состоял из молодых людей. Не менее отрадным будет, если их молодая энергия и ясный ум окажутся востребованными в политическом руководстве оппозиции. Тогда можно надеяться, что наши патриоты из опрофессиональившихся игроков вновь превратятся в борцов за национально-культурное возрождение Беларуси. И добьются того, что сегодня не под силу нашим изрядно уставшим ведущим демократам.

"Народной воле" требуются молодые, энергичные, коммуникабельные руководители своих новых рекламных проектов.
Обращаться в рекламный отдел УП "Народная воля" по тел.: 206-69-04; 206-69-06.

Пр. Васілісы, Настасі, Анастасіі, Андрэя, Дзяменція, Кандрата, Лукіяна, Трафіма. К. Валеры, Людаіка, Паўла, Пятра.

КРАСАВІК
28
СУБОТА

☉ Усход 5.40, Захад 20.36, Даўж. дня 14.56
☽ Перш. квадра 30 красавіка, Захад 1.44, Усход 9.06

Народная Воля
28 КРАСАВІКА 2001 г.

НАВІНЫ

Замах на жыццё ці выпадковае здарэнне?

Юрый Хадыка.

Ходзяць чуткі, што быў замах на жыццё вядомага палітыка і навукоўца Юрыя Хадыкі.

На самай справе ў студзені гэтага года Юрый Віктаравіч лёг у бальніцу на планавую аперацыю. Аднак у перыяд рэабілітацыі яму занеслі інфекцыю і ў яго пачаўся сепсіс. У выніку Хадыка двойчы стаяў паміж жыццём і смерцю... На шчасце, усё абышлося.

Юрый Віктаравіч лічыць гэтае непрыемнае здарэнне звычайнай выпадковасцю і звязвае яго з нявопытнасцю маладога доктара, які вёў яго пасля аперацыі. Ужо тыдзень, як ён пераведзены з рэанімацыі ў звычайную палату і зараз пад наглядам прафесара ідзе на папраўку.

Калектыў "Народнай волі" зычыць Юрыю Віктаравічу хутчэйшага выздараўлення і спадзяецца, што ў хуткім часе ён зможа вярнуцца ў строй.

Таццяна КУЧЫНСКАЯ.

23 надзеі хакейнай Беларусі

Сёння ў Германіі стартуе чарговы чэмпіянат свету па хакеі ў элітнай групе. Як вядома, сярод 16 мацнейшых каманд планеты згуляе і зборная Беларусі.

Падрыхтоўку да сусветнага форуму беларускія хакеісты распачалі ў пачатку красавіка ў беларускай сталіцы, дзе ў двух таварыскіх сустрэчах перайгралі ніжагародскае "Тарпеда".

Збор каманды Анатоля Варывончыка завяршыўся гульнямі на выездзе супраць нацыянальных каманд Аўстрыі і Латвіі. Аўстрыйцы былі двойчы павержаны — 3:1 і 4:3, а вось латышы пасля паражэння 6:3 здолелі ўзяць рэванш — 3:1.

Па выніках таварыскіх сустрэч трэнеры нашай каманды адабралі 23 спартсменаў, якія і будуць абараняць гонар Беларусі на ледовых пляцоўках чэмпіянату свету. Вось іх прозвішчы: галкіперы — Сяргей Шабанаў, Андрэй Мезін і Леанід Фацікаў. Абаронцы: Алег Раманаў, Уладзімір Копаць, Руслан Салей, Алег Хмыль, Сяргей Яркавіч, Аляксандр Журык, Сяргей Стась і Алег Мікульчык. Нападаючыя: Аляксандр Андрыеўскі, Дзмітрый і Васіль Панковы, Андрэй Скабелка, Андрэй Кавалёў, Аляксей Калюжны, Алег Антоненка, Дзмітрый Старасценка, Віктар Карачун, Віталь Валуй, Аляксандр Гальчанюк і Канстанцін Кальцоў.

На жаль, беларускай зборнай не ўдалося пазбегнуць страт. Не згуляе на чэмпіянаце за нашу зборную НХЛ-авец Уладзімір Цыплакоў — яго "Бафала" выйшла ў чвэрцьфінал кубка Стэнлі. З траўмай рукі адправіўся ў Германію Андрэй Мезін.

Беларусы згуляюць у групе А разам са зборнымі Чэхіі, Швейцарыі і Германіі. Першы матч — сёння, сапернік — чэмпіёны свету чэхі. 30 красавіка нашым суперникам будуць швейцарцы, а другога траўня заключны матч групавога турніру беларусы згуляюць з гаспадарамі першынства.

Віталь ГАРБУЗАЎ.

У Яраслаўскай вобласці будуць збіраць беларускія трактары

На прадпрыемстве "Аграпрамтэхзабеспячэнне" ў Някрасаўскім раёне Яраслаўскай вобласці Расіі будзе наладжана зборачная вытворчасць беларускіх трактароў. Дамоўленасць аб гэтым была дасягнута падчас прайноўшага на гэтым тыдні візіту ў Мінск намесніка губернатара вобласці — дырэктара дэпартамента АПК, аховы навакольнага асяроддзя і прыродакарыстання адміністрацыі рэгіёна Міхаіла Баравіцкага.

На працягу двух месяцаў прадпрыемства, якое раней ажыццяўляла толькі тэхнічнае абслугоўванне беларускіх колавых трактароў, павінна падрыхтаваць свае пляцоўкі для зборкі гэтай тэхнікі. Цяпер тут плануецца збіраць 30 трактароў штомесяц па цане ад 220 да 250 тысяч рублёў за машыну. У выпадку рэалізацыі праекта, кошт сабраных у Яраслаўскай вобласці трактароў будзе на трэць ніжэйшы за сённяшнюю рынкавую цану, і ўладальнікі падобных машын у вобласці атрымаюць магчымасць раз у дзесяць гадоў мяняць іх.

Алег САКАЛОЎ.

На маёўку!

У сувязі з тым, што ўлады другі год запар забараняюць дэманстрацыю і мітынг у Дзень Працы 1 Мая, які ў Беларусі з'яўляецца дзяржаўным святам, Беларуская сацыял-дэмакратычная партыя (Народная Грамада) прыняла рашэнне правесці ў лепшых традыцыях міжнароднай і беларускай сацыял-дэмакратыі святочную маёўку ў парку імя М.Горкага.

У праграме — выступленні бардаў, мастацкіх калектываў, раздача сацыял-дэмакратычнай літаратуры, сустрэчы з прэтэндэнтамі на пасаду прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.

Пачатак маёўкі ў 11.00 непадалёк ад цэнтральнага ўваходу ў парк (ст. метро "Плошча Перамогі"). У гэты ж час у парку будзе праводзіць дазволеную ўладамі маёўку Федэрацыя прафсаюзаў Беларуская, якой таксама не далі правесці традыцыйную святочную дэманстрацыю.

Варта нагадаць, што ў Беларусі апошні раз забараняліся першамайскія дэманстрацыі ў пачатку мінулага стагоддзя — пры самадзяржаўі.

Сацыял-дэмакраты запрашаюць мінчан і гасцей сталіцы прыняць актыўны ўдзел у святочных мерапрыемствах. Будзем разам!

"МНЕ ВСЕ ПО БАРАБАНУ", –

так говорит реформатор Белорусского телевидения

Владимир ДОВЖЕНКО

На белорусском телевидении — в разгаре своеобразный "брачный период", время, когда сотрудники заключают трудовые контракты и договора с нанимателем.

Кому-то из них посчастливится в будущем "пробить" свои программы и увидеть их на экранах телевизоров, но большая часть — человек 500 — по-прежнему будет "прикомандирована" к Дирекции перспективного вещания, структуре, появившейся, кстати, впервые за всю историю БТ именно после прихода в прошлом году нового руководства в лице Чикина & К°. А это значит, что практически здоровые и, конечно же, трудоспособные люди остаются снова без любимой творческой работы, хотя и будут исправно получать зарплату лишь за то, что в их трудовых книжках стоит гербовая печать с основного места работы в государственном заведении, что находится на улице Макаенка, 9.

Среди этих неудачников, тщетно ожидающих своего звездного часа, — и начинающие, и известные журналисты, режиссеры, дикторы, ведущие программ. Невостребованным сейчас оказался талант Элеоноры Езерской, Владимира Суббота, Анны Артюшкевич, Алексея Доваля и многих других. Исчезли из эфира их авторские программы, имевшие совсем недавно высокие рейтинги в опросах телезрителей.

Стартовал очередной футбольный сезон, с которым наши болельщики связывают самые радужные надежды (впервые национальная сборная нашей страны реально претендует на поездку на чемпионат мира!), но в это же самое время пропал с экранов популярнейший "Третий тайм", собиравший, пожалуй, самую большую телеаудиторию. А его автор и ведущий, спортивный журналист Алексей Доваль, имевший к тому же самое непосредственное отношение к программам "Супергол", "Стадион", был отправлен в запас еще в феврале — сразу же после выхода в прямом эфире его передачи, рассказывающей о чемпионате мира по биатлону в Словении. Интересная деталь: его непосредственный начальник — Владимир Шпитальников — похвалил Алексея на редакционной летучке за интересный выход и тут же, следующим предложением, отстранил его от дальнейшей работы. Без комментариев. Просто так. По причине, ведомой только ему.

До сих пор молодому журналисту так никто не может вразумительно объяснить: почему.

— Алексей, как это ни печально, но, может, вернемся к самому началу твоей истории. Итак, зима. Успешное выступление белорусов на мировом первенстве. Ты, взявший за свой счет отпуск и благодаря помощи национальной федерации по биатлону побывавший в Поклюке, спешишь по приезде домой еще раз вспомнить в своем авторском "Стадионе" мгновение триумфа сборной, Вадима Сашурина и ...

— ... и меня отстраняют от эфира, в котором я не совсем в характерной для белорусского телевидения форме высказался о президенте: "С каждым годом биатлон завоевывает все большую и большую популярность в Европе. И огромное внимание уделяет этим соревнованием телевидение. Тот же канал "Евроспорт" транслирует все этапы Кубка мира, не говоря уже о мировых чемпионатах. Особняком здесь стоит наше родное телевидение, у которого были все возможности без ощутимых расходов порадовать телезрителей серией трансляций с чемпионата мира в Словении, но решено было ограничиться показом одной мужской эстафеты. Понятно, что нашему президенту больше нравится хоккей, но, согласитесь, это еще не повод для того, чтобы проигнорировать чемпионат мира по биатлону, где мы в числе самых лучших, в пользу второсортного хоккейного турнира, проходящего при пустых трибунах (отборочный олимпийский турнир в Норвегии. — **Прим. автора**) и где за матч наши хоккейные звезды могут произвести лишь по два-три броска по воротам соперников. Остается надеяться, что когда-нибудь в другие времена и белорусских биатлонистов, которые так авторитетны в мире, будут уважать и на Родине".

Тут же по приказу зампредседателя Рыбакова меня и сделали "перспективным", отправив в дирекцию этого самого вещания, где я и числюсь по сегодняшний день. А на естественный вопрос: "Что я должен делать?" получил трафаретный ответ: "Думай, готовь свои разработки, предлагай новые идеи!" Я могу сделать хоть десять этих самых разработок, но вся беда в том, что их никто не будет рассматривать. Или, что называется, "зарежут". Тот же Суббот уже сделал третий вариант своего нового цикла, и все без толку. И аграрная по своей сути страна не имеет на сегодняшний день ни одной передачи о сельском хозяйстве.

Еще прошлой осенью, когда состоялся первый этап подачи заявок, я понял, что их рассматривать вовсе не будут, ведь все было предопределено заранее. Сейчас я получаю, как мы называем между собой, "пенсию" в сумме около 50 тысяч рублей, находясь в самом расцвете творческих и физических сил. А шансов у меня пробиться сейчас в эфир нет никаких, будь я даже семи пядей во лбу. Ведь в конкретном случае Доваля лишили творческой работы совсем не из-за понижения профессионального уровня. За шесть лет в эфире принципиальных претензий ко мне не было.

— Ты комментировал футбол, выезжал на матчи сборной за рубеж... Кроме тебя в эту элитную тройку входил журналист "Прессбола" Сергей Новиков и, позволь попутить, почти уже по всем параметрам "белорусский Озеров" — Владимир Новицкий. Может, ты попросту оказался "третьим лишним"?

— Вполне возможно. Знаете, завтра на телевидении могут поставить руководителем любого тракториста, он наберет себе подобных, и они будут делать национальный телеканал по своему разумению. И что в итоге получится? То, что и сейчас, а то и похуже, пострашнее. Господин-товарищ Евгений Новиков, который в самое "смотрибельное" вечернее время рассказывает без передыху 20 минут, как в США обидели негра, и утверждает, что это угрожает белорусскому народу. Идиотизм какой-то! Или Азаренок, Рудометов. К слову, для всех программ, которые ведут эти господа, закупили очень дорогостоящее современное оборудование...

О чем можно говорить, если высокий начальник с пятого этажа на общем собрании в штыки встречает любые новации и, как щитом, прикрывается фразой: "Я заместитель министра. Мне все по барабану"...

А когда я работал еще в эфире и оформлял гонорарные ведомости, то регулярно слышал напоминания, что в них мы должны вносить фамилии наших начальников, хотя эти люди никакого отношения к программам не имели. Более того, нам запрещали вписывать напротив этих фамилий сумму гонорара, это делали выше.

— Алексей! Странная возникает ситуация. Каждый день приходит на работу каменщик шестого разряда, ходит по стройке, не притронувшись к кирпичу, и за это безделье получает еще и деньги. Очевидно, это невыгодно государству, строительной организации. Практически то же самое происходит сейчас и на БТ...

— Значит, так выгодно руководству. Это устраивает и нас, изгоев. Ведь, как известно, творческие работники в массе своей не солидарны. Это в Чехии смогли отстоять свои права на телевидении, и вот уже на НТВ получился раздрай. А наши, выходит, себя вообще не уважают. Или "лянота беларуская" тому помехой, или ... А если честно — обыкновенная трусость.

— Но ведь понятно, что с каждым днем ситуация на БТ становится все хуже и внутри коллектива, и мы видим это на экранах по выпуску вашей "продукции".

— Я очень надеюсь, что эти времена изменятся, будет в цене профессионализм, порядочность, гордость, в конце концов. Будут действовать хотя бы элементарные законы, позволяющие спокойно и стабильно трудиться.

— Успехов тебе! Спасибо за интервью.

Персики против радиации

Одна из важнейших задач Полесского радиационно-экологического заповедника, который является крупнейшим на территории Беларуси (в два раза больше Беловежской пущи), — проведение научных исследований растительности и животного мира, влияния на них радиационного загрязнения. С этой целью на площади в полтора гектара и был посажен персиковый сад из саженцев, районированных для климатических условий Беларуси. Третий год плодоношения персиков позволил дать заключение: ни их плоды, ни косточки радионуклидов не накапливают.

На снимке: *опять зацвели персики в Полесском заповеднике. Постоянное наблюдение за ними осуществляет заведующий сектором акклиматизации растений научного отдела заповедника Михаил МИХЕД.*

Фото Сергея ХОЛОДИЛИНА, БелТА.

ТРИ ПИСЬМА

Нет, мы не рабы!

Прочитав в "Народной воле" статью А.Ольхового "Рожденные ползать?..", решила впервые написать в газету, потому что, как и он, не могу молчать.

Я — мать, жена, хозяйка, работница, казалось бы, тут не до политики. Но уж очень замучили нищета и бесправие. До каких пор, до какого предела мы будем опускаться и прогибаться все ниже и ниже? Все СМИ твердят, что мы с каждым годом живем все лучше и лучше. Но ведь даже 3 года назад за свою зарплату я могла купить 30 кг все той же, простите, колбасы, а сегодня — 5 килограммов. Я же не стала хуже работать, скорее наоборот: за 3 года приобрела больше профессионального опыта.

Рыба гниет с головы! Возьмем в деревне толкового, работящего хозяина. У него и во дворе, и в доме, и в семье, и на работе (на службе) порядок, и семья живет зажиточно. Хозяин — шалопай, работает языком, а не делом, у него и дом на подпорках, и в семье ладу нет, и на работе спустя рукава трудится. Сейчас у нас вся страна на подпорках, а народ с каждым днем все нищает. Не пора ли сменить такого хозяина, чтобы не хоккейной игрой, не лыжней народ был сыт, а чтобы на столе были хлеб, молоко, да и колбаса с маслом?! Ведь лыжный костюм купить мы не в состоянии, не говоря уже о хоккейных доспехах для сына или внука...

Автор статьи затрагивает тему выборов. Действительно, нельзя молчать на эту тему — не молчится. Я с ним согласна на все сто процентов, что действительно у нас, в нашей "тьму-тараканы" легче и проще "химичить", выводить нужный процент проголосовавших.

Почему мне говорят, за кого я должна голосовать? Хватит указывать! Я хочу сама выбирать тех, кого я считаю достойными!

Нет, господин А.Ольховой, не рождены мы ползать! Народ не хочет быть зомби, быдлом, рабом. Он поднял голову, имеет свое мнение, в отличие от лизоблюдов батькиных! Важно, чтобы его голос был все громче и внятнее. И мы победим!

На первый раз своим именем подписываться не стану. Провинция, знаете ли. Тут у нас "задавить" человека, не согласного с вертикалью, с официальной точкой зрения — как раз плюнуть.

Анна ВОЛОДИНА.
г.Дубровно
Витебской области.

Возьмемся за руки, друзья!

Я бесконечно благодарна А.Ольховому за его смелую, открытую, патриотичную статью. Читаешь ее — и болью отдается каждая строчка, тем более что мысли статьи идут в унисон с твоими собственными, затрагивают наболевшие проблемы, от решения которых мы все уходим: кто от слабости, кто от безразличия, кто от страха и неверия в справедливость, а кто — от беспробудного пьянства и деградации.

Конечно, невозможно все изменить разом, но стань мы каждый на своем месте честнее, открытее, найди в себе силу противопоставить собственное достоинство хаму и негодяю любого ранга — не пройдет это бесследно для тебя, твоих детей и окружающих людей. Кто-то задумается, кто-то последует примеру, а кто-то просто не станет хуже. Разбудить гражданскую совесть и призвана такая пресса, которая не боится напечатать правду о нас всех.

Еще раз убеждаешься: вот они ростки настоящей демократии — наличие нескольких партий, свободная пресса, а у народа — возможность выбора. Только не надо ничего никому навязывать, как это делает официальная пропаганда, и приватизированные А.Лукашенко государственные газеты и Национальное телевидение. Наш президент часто повторяет: "Народ сам во всем разберется". А я вот, как маленькая частичка этого народа, хочу разобраться, почему за кандидатов в депутаты всех уровней государственного управления мы голосуем, хотя порой совершенно не знаем этих людей и ничего не узнаем об их конкретных делах уже в качестве депутатов? А руководителей на местах, где приходится ежедневно быть бок о бок, решать множество проблем, нам навязывают, заключают контракты с ними без ведома коллектива. Наверное, надо начинать отсюда, "снизу". А дальше эта цепочка будет продолжаться в столь же логической и справедливой последовательности.

С уважением
Зинаида АЛЕСЕНКО.
г.Орша.

Выходи, мой народ...

Уважаемый господин главный редактор газеты "Народная воля" И.Середич! Спасибо Вам за статью публициста Александра Ольхового "Рожденные ползать?..". Прочитала ее с огромным удовольствием. Статья запала в душу, как заноза, не дает покоя, заставляет высказаться, излить душу. А времени нет, все мы заняты поиском хлеба насущного. Я работаю медсестрой, муж, офицер запаса, чуть ли не каждодневно пропадает в деревне, в отчем доме, где у нас есть небольшое подсобное хозяйство: поросенок, куры, кролики. Если бы не эта "подсобка", мы бы уже давно "отбросили коньки", так как двое детей — студенты, и почти все наши заработки и пенсия мужа уходят на них.

Сто раз прав А.Ольховой: и мы, белорусы, рабы, и наши "старшие братья" россияне. Как можно было избирать в "палату" того же Янчевского-болтуна, лизоблюда власти, будущего номенклатурщика? А всех других? Вы посмотрите, какие они ("палатники") все серые, бестелесные, запуганные, неспособные сказать что-то умное, интересное.

Простите за спешку: хотелось еще о многом написать, но некогда, надо добывать хлеб насущный, выживать... Так держать, "Народная воля"! Беларусь будет свободной и независимой, если мы встанем с колен и больше не будем рабами.

Соня СПЕРАНСКАЯ.
г.Лепель.

ЛЁСЫ ЛЮДСКІЯ

ГАЛАСЫ КРЫЖОЎ

Васіль ГРОДНІКАЎ

Ці зіма на двары, ці гарачае лета, ці мокрая восень, у вёсцы ціха, як у дамавіне. Хіба што пеўні сяды-тады расяюцца, суседскія сабакі набрэшуць на паштальёнку ды каторы п'яны мужык пабегае з сякерай ці нажом за жонкай (бывае і наадварот).

Людзей мала. І тыя больш па хатах ды ў паветках. Кожны пры сваіх справах: хто па гаспадарцы шчыруе, хто шукае, дзе б выпіць, хто ўжо спіць, прыняўшы на грудзі "снатворнага", а каму нездаровіцца, і ён уподай просіць Бога хутчэй забраць да сябе.

Вёска сёння — гэта рэзервацыя, дзе асела трэцяя частка насельніцтва краіны. Раздзелены яны па "бараках" — у 2.600 калгасах і саўгасах. Роля і аўтарытэт сельсаветаў намінальны: даць даведку, прыпісаць на сталае або часовае жыхарства (па-прыгоннаму — замацаваць за памешчыкам), сабраць падаткі на зарплату сельсавецкім "пісарам" ды яшчэ сёе-тое па дробязях. Калгасы і саўгасы цяпер — фактычна дзяржаўныя структуры на вёсцы, аснова і апора рэжыму ў татальным кантролі за ціхім і памяркоўным мужыком, надзейным электаратам улады.

Водгулдзем успамінаецца дзяцінства, калі на вёсцы ў кожнай хаце на кожнае акно было душы па дзве падшываніцаў. А сёння, бывае, на ўсе аканіцы адзін маршчыністы твар, агорнуты стракатай хусцінкай. Глядзіць старая кабета гадзінамі на вуліцу, пэўне, стараецца запомніць сумны вобраз сённяшняй вёскі ды забраць тую памяць у лепшы свет, каб здзівіць тамтэйшых нябожчыкаў: на іх радзіме ўсё горш і горш...

Вёска з сённяшнімі яе насельнікамі (яны ўсё часцей пазіраюць на гаторага, каб дол выкапаў. А ўгаворыш, то выкапае ямку з сякерай ці нажом за жонкай (бывае і наадварот).

Часам не верыш гісторыкам, што некалі на гэтай зямлі жылі гордыя ды заможныя, нязломныя і адчайныя людзі, што не ведалі страху, не гнуліся і дзяцей сваіх выхоўвалі на лепшых прыкладах слынных продкаў. Называліся тыя людзі ліцвінамі, а не калгаснікамі.

А цяпер, каго ні спытаеш са старых, то пачуеш: а што яшчэ нам трэба — хлеб аўтаўлаўка прывозіць, пенсію даюць рэгулярна. Пры гэтым успамінаюць вайну і пасляваенную галечу і ўсё тое параўноўваюць з сённяшнім днём. "Дзякуй Богу, — кажуць, — што няма вайны. Колькі нам засталося? Мы тут ужо ў гасцях". І дзівішся часам, што ніхто пры гэтым чамусьці не думае пра дзяцей, унукаў і праўнукаў. Не шкадуюць, што ім нічога не застанецца, акрамя старых хат і пакошаных хлявоў. Можа, у каго і было колісь на ашчадных кніжках колькі тысяч, а цяпер тых кампенсаваных грошай хопіць на два кукішы пад нос начальству. "На нашы грошы начальства сабе харомаў набудавала..." Але ні папроку ў голасе, ні адчаю. Абгаворваюць спакойна, быццам забралі не іхняе, а чужое, як некалі без спачування назіралі за бальшавікамі, якія падчышчалі ўсё з двароў іх больш заможных суседзяў. Можа, гэта адплата за тое, што моўчкі патуралі злу, а то і радаваліся часам бядзе іншых?

Мала хто задумваецца: чаму кепска пражыў сваю жытку. Яны ўсё сваё жыццё цаклалі на "росквіт" калгаса, потым — саўгаса, а пасля — зноў калгаса, працуючы іншым часам за адны "палачкі", за ламаны пятак ці за паўкіла жыта і посцілку ячнай саломы.

Сёння калгасы не ў стане дапамагчы нават пахаваць сваіх былых калгаснікаў. Бывае, што і дошак на дамавіну няма. Радня па гарбылю ў суседзяў збірае. Ды яшчэ паспрабуй угаварыць каторага, каб дол выкапаў. А ўгаворыш, то выкапае ямку з салдацкі акоп. Чаго добрага, сабакі ці ваўкі за ноч дастануць нябожчыка...

Хоць і жылі і працавалі ўвесь свой век у калектывах, але прывыклі дбаць толькі пра сябе. У такім ліханкавым асяроддзі, калі ні дзяржаве, ні дзецям, ні радні нельга даверыцца, не жылі і не жывуць заўтрашнім днём, а па завядзёнцы: што выпіў, што з'еў — тое наша.

Часам ні добрай памяці пра сябе, ні добрай справы пасля сябе. А з тых, хто застаюцца яшчэ жыць, у шмат каго памяць ужо адпітая.

Не помняць, як грашылі...
Не помняць, ці гаварылі каму
добрыя словы...
Не помняць, ці маліліся калі...
Не помняць, ці любілі каго...
Не помняць, які сёння дзень...
Замест "Даруй, Госпадзі!" —
мат-перамат...
Замест дабрыні — зайздрасць,
злосць, спакуса...
Замест малітвы — пляшка
самагонкі без закускі...

Сын б'е маці, бацьку. Унук адбірае пенсію ў бабулі, выносіць з хаты ўсё, што можна. Каб выпіць, пахмяліцца.

Шкада, што тыя з нас, хто не задумваецца пра сэнс свайго існавання на зямлі і не імкнецца адпавядаць свайму прызначэнню на гэтым свеце, даюць шмат дадатковай працы Усявышняму па ачышчэнні Сусвету ад грахоў і прымушаюць яго высільвацца, каб даць нам больш ахвоты стаць хоць крыху лепшымі.

Пашкоджана асяроддзе, дзе парушана гармонія быцця, першасная аснова Сусвету ў дачыненні да Зямлі і асобных яе рэгіёнаў, парушана суладдзе ўзаемнай адказнасці пакаленняў перад сваімі продкамі, гісторыяй. Станем больш духоўнымі — тады нам адкрыецца шлях да ісціны. А дазволім і надалей правіць на зямлі "праваслаўным атэістам" і чыноўнікам-"падсвечнікам" ды будзем па-ранейшаму бяздумна і паслухмяна ісці за імі пад посвіст "вертыкальнага" бізуна, — дарога нам да лепшай долі закрыта.

Так і будзем блукаць, дарэмна стараццa перайначыць на свой лад агульнапрызнаную мадэль хрысціянскага суіснавання ды згараць ад злосці і зайздрасці. Звядзём сваю жытку да пагорку з жоўценькім пясочкам за вёскай ці горадам, так і не патрапіўшы за тую мяжу, за якой маглі б стацца людзьмі. А не быдлам...

Будуць мяняцца рэжымы, будуць сыцець і патанаць у раскошы правіцелі, таўсцець на аб'едках з царскага стала прыдворная знаць, нам жа ідэалагічныя кухары будуць плюхаць у міску прапагандыскую пахлёбку і наліваць шклянку агітацыйнага хмелю. Тады мы і надалей будзем паслухмяным быдлам. Тут, дзе некалі буяў святы агонь свабоды, гонару і годнасці ліцвінаў, будзе ціха, млява, як у зачараваным сне. Затое надзейна для ўладаў, тыранаў і дыктатараў розных колераў.

Баючыся граху, нікога не асуджаю, а толькі занатоўваю свае думкі, што неадступна ідуць за мной апошнія гады ў вясковай глухамані, спадзеючыся, што, можа, хто-небудзь з вяскоўцаў яшчэ паспее адумацца і спахопіцца, аглянецца. А калі азірнецца і заўважыць, колькі награшыў на гэтай зямлі, можа, сціснецца ягонае сэрца ад сораму ці спачування да самога сябе. Тады яшчэ не ўсё згублена...

Шкада, што сапраўдныя ісціны мы пачынаем спасцігаць толькі на парозе ў лепшы свет. Але суцяшае, што хоць і не можам мы генетычна перадаць нашчадкам сваё азарэнне, затое, на маю думку, напаследак асвятляем свой след на зямлі духоўна-містычнай, псіхалагічнай аурай, настоенай на нашым вопыце жыцця і глыбіні нашай духоўнасці. Хто пажадае, той будзе мець гэтую ауру, хто адчуе патрэбу ў ісціне, таму знойдзецца. Будзем спадзявацца...

Вяскоўцы старэюць, становяцца нямоглымі і адзінокімі. Гэта можна заўважыць без аніякага сацыялагічнага даследавання. Дастаткова паглядзець на статак свойскіх кароў, што ідуць на пашу або вяртаюцца з выпасу. У год майго прыезду ў Мазалі на сталае жыхарства ў сярэднім на кожны двор было па 2—3 каровы. Сёння на 2—3 двары — адна кароўка. Парадзела і птушынае царства: 3—5 курак на падворку. Пра свіней даклала сказаць не магу. Пэўне, і гэтай скаціны хапае толькі на адну свежаніну ў год. Камбікорм дарагі, гадаваць на казённым хлебе — сабе даражэй. Затое мясцовая "гара" ў паўтара-два разы таннейшая за "казёнку". Ёсць чым заліць "пажар" душы з-за няспраўджаных надзей...

"Сціранне граняў" паміж горадам і вёскай, пра якое так марылі бальшавікі, тут, у вёсцы, здзейснілася. Сцерлася ўшчэнт першым чынам спрадвечная культура вясковага ўкладу. Рэшткі яе калечацца сёння сталым пакаленнем і прыезджымі на канікулы дзецюкамі — унукамі і праўнукамі — пад уздзеяннем самагоннага і віннага перагару.

Колішняя вясковая гармонія жыцця пры дапамозе бязглуздавых, беззямельных камунараў, прысланых з гораду камісараў дала спачатку трэшчыну, а потым і зусім рассыпалася ад вераломнай усеагульнай калектывізацыі спачатку на ўсходзе краіны, затым — на захадзе.

Высахлі крыніцы дабрыні і справядлівасці, набожнасці і сарамлівасці, святой адказнасці за спрадвечны ўклад па-сяраўднаму чалавечых адносін. Замест іх прыйшлі гвалтоўнасць, бязбожнасць, крадзеж, гультайства, бессароннасць і выслужніцтва перад вялікімі і малымі начальнікамі.

У сэрцах пасяліўся страх не перад Богам, а перад уладамі. Ён, гэты страх, кляшчамі ўпіваецца ў душы сялян. Страх стаў галоўным пачуццём — як найгалоўнейшае дасягненне і здабытак сацыялізму ў вёсцы і горадзе. І сёння гэты страх з'ядае людскія душы, як з'ядаюць людскія істоты алкаголь, сухоты, рак, СНІД...

Гэта вам пацвердзіць сумнае аблічча сённяшняй вёскі, могілкі з яшчэ новымі крыжамі, якія не паспелі спілаваць на дровы вясковыя "камунары", не пабурылі рагулі і не раскапалі тутэйшыя свінні...

Маўчаць крыжы. Дакорлівы іх позірк. А можа, могілкі нешта перадаюць нам з царства Аіда сваімі надмагільнымі збудаваннямі, што нагадваюць своеасаблівыя антэны? Ды толькі мы пакуль не можам адчуць, зразумець сігналы-папярэджанні, адрасаваныя нам, яшчэ жывым.

Не, мы не чуем галасы крыжоў. Пэўне, таму, што парушана суладдзе чалавека з космасам і зямлёй, разарвана сувязь пакаленняў, зруйнавана сапраўдная гісторыя краю. Нашы вушы ўспрымаюць праўду як зло, хлусню — як боскую дабрачыннасць...

Скалечаны XX век спаганіў людскія душы, гармонію чалавечага суіснавання. Наступныя пакаленні будуць збіраць тыя каменні, якія кінулі мы ў наша мінулае. Яны будуць жаць ніву, якую мы засеялі для іх атрутным насеннем.

Мы не ведалі, што тварылі.
Даруй нам, Госпадзі!..

в.Мазалі
Маладзечанскага раёна.

Размещая рекламу на страницах "Народной воли", Вы не только укрепляете свой бизнес, но и строите новую Беларусь!

Рекламу не обязательно доставлять в редакцию, ее можно вместе с гарантийным письмом передать по факсу: (017) 206-69-04.
Телефон для справок: (017) 206-69-06.

29 КРАСАВІКА МІКОЛУ ЕРМАЛОВІЧУ СПОЎНІЛАСЯ Б 80 ГАДОЎ

АМАЛЬ НЕВІДУШЧЫ, ЁН АДКРЫВАЎ НАМ ВОЧЫ НА ПРАЎДЗІВУЮ ГІСТОРЫЮ БАЦЬКАЎШЧЫНЫ



Мікола ЕРМАЛОВІЧ

Мікола Ермаловіч шырока вядомы ў нашай краіне як выбітны даследчык старажытнай гісторыі Беларусі. Плён ягонай 40-гадовай працы — у кнігах "Па слядах аднаго міфа", "Старажытная Беларусь", "Беларуская дзяржава — Вялікае княства Літоўскае". Першая пабачыла свет у 1989-м. А да таго, цягам ажно 20 гадоў, перадавалася з рук у рукі, хадзіла ў народзе ў рукапісным варыянце пад назовам "Сто старонак". То былі сто старонак праўдзівай гісторыі Беларусі.

Амаль невідушчы, Мікола Ермаловіч павёў за сабою мноства відушчых, якім раней засціла вочы афіцыйная псеўдагісторыя. Сваёй апошняй кнігі — грунтоўнага даследавання ад Вялікага княства Літоўскага да падзелу Рэчы Паспалітай — аўтар не пабачыў, не дажыў да гэтай падзеі ўсяго тры месяцы. Ён быў збіты машынай на пешаходным, добра вядомым яму пераходзе, непадалёк ад дома, дзе жыў.

Сёння ў грамадстве шырыцца цікавасць гісторыяй Беларусі, расце попыт на кнігі Міколы Ермаловіча і пашана да выдатнай асобы вучонага. Але рэдка хто ведае Міколу Іванавіча яшчэ і як паэта, празаіка і крытыка, які пакінуў у спадчыну свае літаратурныя творы, гэткія ж небяспечныя для тагачаснага рэжыму, як і гістарычныя даследаванні. Яны пашыраліся ў вузкім коле сяброў, якія і захавалі іх для нашчадкаў.

Сёння мы прапануем чытачам твор Міколы Ермаловіча ў жанры гутаркі-эсэ пад назвай "Существительное" (са сховаў Аляксея Марачкіна).

Ірына ЛЯКСЕЕВА.

"СУЩЕСТВИТЕЛЬНОЕ"

Змітрок выйшаў са школы яшчэ больш невясёлы, чым у ранейшыя дні. Усе яго непрыемнасці пачаліся ад таго, што ён не так гаворыць, як трэба. Праўда, летась, калі ён вучыўся ў першым класе, яму настаўніца пра гэта нічога не казала. Наадварот, яшчэ хваліла яго за тое, што ён так прыгожа гаворыць. Але новая настаўніца, якая стала вучыць яго ў другім класе, увесь час папраўляе яго, як і іншых дзяцей, і вучыць, як яна кажа, правільна і прыгожа гаварыць. Але ў Змітрака гэта зусім дрэнна выходзіць.

Ужо ў першы дзень, знаёмячыся з вучнямі і пытаючыся, як каго завуць, настаўніца сказала яму, што Змітраком называцца непрыгожа і што яна будзе зваць яго Дзмітрыем. І хоць прайшло некалькі ўжо тыдняў, але Змітрок ніяк не можа прызвычаіцца да новага імя. І калі настаўніца звяртаецца да яго, называючы Дзмітрыем, яму здаецца, што гэта яна не яго, а некага іншага выклікае.

Пасля яна адучыла Змітрака ад слова "як". Ён ніяк не можа ўцяміць, чаму непрыгожа гаварыць "як", а прыгожа "как". Яму наадварот, "как" здаецца непрыгожым, і ён саромеецца вымаўляць гэтае слова і маўчыць. Настаўніца салзіць яго, зазначаючы: "Странный ты, мальчик, Дмитрий".

А сёння вучылі *существительное*. Змітрок ледзь навучыўся вымаўляць гэтае слова. Пасля быў здзіўлены, калі зразумеў, што ўсё на свеце — существительное. І душа Змітрака ніяк не магла прыняць гэтага. І птушкі, і дрэвы, і рэчка, і звяры, і ўсё-ўсё — толькі существительное. Яму стала страшна і сумна. Змітрок стаў думаць над тым, на што падобна гэтае дзіўнае существительное. У яго ўяўленні ўжо было прамільгнула нешта страшэннае, але адразу знікла. Змітрака ў гэты час выклікала настаўніца:

— Ну, Дмитрий, приведи мне примеры существительного. Я тебя второй раз спрашиваю, а ты все не слышишь.

Змітрок устаў, падумаў крыху і пачаў называць существительные. Пасля кожнага сказанага ім слова ён прыпыняўся, бо яны выклікалі ў яго ўяўленні жывыя малюнкі ўсяго таго, што ён бачыў і чым любаваўся кожны дзень, ідучы ў школу і назад.

— Бусел... — пачаў ён. І адразу ўявіў буслоў на вялізным і таўшчэнным лугавым дубе. Змітрок заўсёды падоўгу глядзеў на іх нават тады, калі яны не варушачыся стаялі на гняздзе...

— Гай... — на міг праплыў перад вачыма невялічкі гай з яго бярозкамі, такімі белымі, што яны Змітраку здаваліся пабеленымі, і ён ніяк не мог утрымацца ад таго, каб не правесці рукой па кары некалькіх бярозак і пасля не паглядзець: ці не засталася пабелка? І хоць рука была чыстая, але і ў наступныя разы ён праводзіў рукой па бярозках і пасля глядзеў на яе...

— Жыта... — працягваў Змірок. На момант з'явілася поле з жытнёвай рунню, такою непрывычна зялёнаю ў гэты час, калі ўсё ўжо пачало жаўцець...

— Шпак... — адразу ў вачах узнік ясень ля бацькоўскай хаты, на ім каля шпакоўніцы сядзіць шпак. Ідучы ў школу і вяртаючыся назад, Змітрок заўсёды махаў яму рукой...

Змітрок хацеў яшчэ сказаць некалькі слоў, але яго спыніў ласкавы голас настаўніцы:

— Подожди, Дмитрий, ты опять неправильно говоришь. Надо говорить не бусел, а аист, не гай, а роща, не жито, а рожь, не шпак, а скворец. Ну, повтори, как нужно говорить.

Змітрок адразу збянтэжыўся. Яснасць, якая пачала ўсталёўвацца ў яго галаве, знікла. Значыць, не кожнае слова можа быць существительным. Спачатку трэба, каб яно стала нейкім пярэваратнем, пра якіх ён ведаў з дзедавых казак, і толькі тады яно можа зрабіцца существительным. І Змітрок маўчаў. Настаўніца зноў сказала паўтарыць словы.

— Аіст, рошча, скварэц, рож, — услед за настаўніцай гаварыў Змітрок і дзіўна, гэтыя словы нічога не выклікалі ў яго ўяўленні, нібы ён называў нешта ніколі не бачанае ім.

— Садись, Дмитрий, и никогда не капризничай, когда тебя учат.

І вось зараз, ідучы са школы, ён прадаўжае раздумваць над гэтым дзіўным существительным. Ён усё ніяк не можа ўявіць, на што яно падобнае. Глыбока задумаўшыся, Змітрок быў безуважны да ўсяго. Ён не палюбаваўся буслам, а яны ж сёння нават ляталі каля гнязда, не правёў рукой па кары бярозак, хаця ў гэты сонечны дзень яны выглядалі асабліва белымі, безуважна прайшоў каля жытнёвай руні і не прывітаў рукой шпака. Дома ён таксама думаў пра существительное.

А ўночы прысніўся яму сон. Нібы ідзе ён са школы і бачыць, як насустрач яму паўзе вялізнае, доўгае страшыдла. Ды не паўзе яно, а ўсё расцягваецца ўздоўж і таўсцее. Змітрака апанаваў страх. Ён аглянуўся назад, па баках — нікога не было. І ад гэтага стала яшчэ больш вусціша. А тое доўгае, тоўстае, пачварнае ўсё больш расцягвалася і набліжалася да яго. Змітрок немым крыкам спытаў:

— Што гэта?

Хтосьці нябачны адказаў яму:

— Гэта существительное.

А Существительное ўжо расцягнулася да клёну, падняло галаву і пытаецца ў шпака, які сядзеў там:

— Ты кто?

— Я — шпак, — адказвае той.

— Нет, ты не шпак, а скворец, — гаворыць Существительное, раззяўляе сваю зяпу і глытае шпака разам са шпакоўняй і ясенем і, патаўсцеўшы, расцягваецца далей.

Хаця Существительное было страшным і агідным, аднак голас яго ласкавы, і здаўся ён Змітраку вельмі знаёмым.

— Дык гэта ж такі голас у нашай настаўніцы, — пазнаў ён.

А Существительное ўжо расцягнулася да гаю, падняло галаву, і Змітрок зноў чуе:

— Ты кто?

— Я — гай.

— Нет, ты не гай, а роща.

І гай гэтак жа знік, як і шпак, а Существительное, зноў патаўсцеўшы, расцягваецца далей, глытаючы ўсё на сваім шляху. І ў мілым кутку Змітрака застаўся толькі бусел.

— Можа яно не заўважыць бусла? — са шчаслівай надзеяй падумаў Змітрок. Ды не! Вось яно расцягваецца ў бок дуба, уздымае галаву, і да Змітрака даходзіць жахлівая гутарка:

— Ты кто?

— Я — бусел.

— Нет, ты не бусел, а аист...

І бусел знікае разам з дубам. Што ж яно цяпер будзе глытаць? А пачварнае Существительное зноў пачало расцягвацца і ўжо ў бок Змітрака. Чаўсьці ён раней не думаў, што яно можа праглынуць і яго. І толькі зразумеўшы гэта, ён скамянеў ад страху. А Существительное ўжо расцягнулася да яго.

— Ты кто? — пытае яно.

— Я — Змітрок, — ледзь варочаючы языком, адказвае ён.

— Нет, ты не Змітрок, ты — Дмитрий, — гаворыць яно, раззяўляе зяму і... тут Змітрок прачнуўся.

— Добра, што я прачнуўся, а то яно і мяне з'ела б, — па-дзіцячы падумаў Змітрок. Але страх яго быў не доўгім. Ён хутка змяніўся радасцю ад таго, што Змітраку нарэшце ўдалося даведацца, на што падобна гэта дзіўнае Существительное.

ОДИН ЛИШЬ ТЕЛЕФОННЫЙ ЗВОНОК – И С УДРУЧАЮЩЕЙ ВАС ПРОБЛЕМОЙ ПОКОНЧЕНО

"Клиника ОН" — международная сеть клиник по лечению мужских сексуальных расстройств



Просто интересно, как мужчины, у которых не все в порядке с тем, что касается интимной стороны жизни, ухитряются замаскировать все это от самих себя. Какая изобретательность, какая снисходительность к собственной персоне! "Ну, так уж случилось", "жена с этим смирилась", "у меня на работе все время сплошные стрессы" и т.д. Все, что угодно, — только не признаться честно самому себе, что, увы, далеко не все в порядке или совсем не в порядке и надо с этим что-то делать. А сделать нужно всего лишь один маленький шаг.

Есть клиника, где понимают, что эта проблема сама по себе не красит вашу жизнь, и там не хотят доставлять вам лишние неприятности. В "Клинике ОН" занимаются только проблемами, связанными с сексуальными расстройствами у мужчин, поэтому опыт работающих здесь специалистов гораздо серьезнее, чем у урологов, которые работают в обычных поликлиниках и ведут прием пациентов с самыми разными урологическими проблемами.

В настоящий момент и в Минске открылся Международный медицинский центр "ОН Клиник-Минск", который относится к международной сети "ОН КЛИНИК". Если в филиале в Германии опробован новый лекарственный коктейль, дающий хорошие результаты, то в течение очень короткого промежутка времени минские пациенты тоже могут получить подобный коктейль. Не стоит запускать такое явление, как сексуальные расстройства, еще и по другой причине: они могут быть симптомом довольно серьезного заболевания — такого, как диабет или рассеянный склероз. Известно, что сексуальные расстройства не вызываются чисто медицинскими причинами. Есть, например, синдром разлуки. Пожилой мужчина, став вдовцом, долгое время находится в трауре, и поэтому, даже осознав, что пора возвращаться к жизни, он оказывается в затруднительном положении — ведь у него уже очень давно не было интимных контактов. Он боится новых контактов, боится, что "окажется не на высоте". В этом случае мы направляем пациента на прием к сексологу нашей клиники. В некоторых случаях консультации сочетаются с медикаментозным лечением, и когда налаживается эрекция, когда мужчина видит, что функция восстановлена, что он вполне полноценен в физиологическом отношении, у него появляется уверенность в своих силах, и это, в сущности, означает, что мы справились с решением проблемы.

Если эта статья попадется на глаза женщинам — пусть они узнают, что они тоже могут сыграть серьезную роль в решении проблемы. Женщина сама может позвонить по указанному в этой статье телефону и посоветоваться. Стена молчания вокруг всего, что касается интимной стороны жизни, — это вероятная причина для измен и разводов. Нужно всего лишь позвонить и назначить встречу. На самом деле это просто и оправданно.

Запись на прием в Международный медицинский центр "ОН Клиник-Минск" по тел.: (017) 283-23-23.

Адрес: ул.Богдановича, 53.

МЕЖДУНАРОДНЫЙ МЕДИЦИНСКИЙ ЦЕНТР «ОН КЛИНИК-МИНСК»

ON CLINIC MEDICAL CENTER

Лиц. №1882 МО РБ 30.10.0001.10.05

СЕЙЧАС ВЫ СМОЖЕТЕ ПОСЕТИТЬ 82-Й ФИЛИАЛ "ОН КЛИНИК", И ЭТОТ ФИЛИАЛ — В МИНСКЕ!

Лучшие мировые достижения науки! Десятилетний опыт!

28 красавіка — 6 мая ШТО? ДЗЕ? КАЛІ?

ТЭАТРЫ

Нацыянальны акадэмічны тэатр балета

29 красавіка — П.Чайкоўскі "Шелкунчик", балет у дзвюх дзеях.

2 мая — С.Пракоф'еў "Ромео и Джульетта", балет у трох дзеях.

4 мая — А.Мдзівані "Страсти" ("Рогнеда"), балет у дзвюх дзеях.

6 мая — П.Чайкоўскі "Лебединое озеро", балет у чатырох дзеях.

Нацыянальны акадэмічны тэатр оперы

28 красавіка — М.Мусаргскі "Барыс Гадуноў", опера ў трох частках.

29 красавіка — Ц.Кюі "Кот у ботах".

6 мая — М.Мінкоў "Чароўная музыка", опера-казка ў дзвюх дзеях.

Нацыянальны акадэмічны тэатр імя Янкі Купалы

28 красавіка — Ю.Ломаўцаў "Піраміда Хеопса", драма ў адной дзеі.

29, 30 красавіка, 2, 3 мая — А.Дударэў "Чорная панна Нясвіжа", містычная легенда аб любові ў адной дзеі.

6 мая — бр.Далёкія, М.Чарот "Ажаніцца — не журыцца", беларускія вадэвілі ў дзвюх частках.

Дзяржаўны маладзёжны тэатр

28 красавіка, 2, 3 мая — Б.Шоў "Пигмалион", раман у дзвюх дзеях.

4, 5 мая — Ж.Б.Мальер "Плутні Скапэна", камедыя ў дзвюх дзеях.

"Віртуозы сцэны"

29 красавіка — Д.Псафас "Дурацкая любовь", эксцэнтрычная камедыя.

Мінскі тэатр драмы "Дзе-Я?"

29 красавіка — Л.Фельдак "Чараўнік Батафога", казка.

Нацыянальны акадэмічны драматычны тэатр імя М.Горкага

28 красавіка — М.Ашар "Кто твой любовник, Жозефа", камедыя-дэтэктыў у дзвюх частках.

29 красавіка — Ж.Ануй "Дикарка", музычная меладрама ў дзвюх частках.

2 мая — А.Конт "Папа, папа, бедный папа!..", сучасная музычная камедыя ў дзвюх частках.

3 мая — М.Ашар "Кто твой любовник, Жозефа?", камедыя-дэтэктыў у дзвюх частках.

4 мая — І.Губач "Адъютант-Ша Его Величества", камедыя ў дзвюх частках.

5 мая — Д.Фо, Ф.Рамэ "Свободный брак" у дзвюх частках.

6 мая — Ж.Ануй "Дикарка", музычная меладрама ў дзвюх частках.

Тэатр юнага гледача

28 красавіка — М.Варфаламееў "Палёт у краіну мрояў".

29 красавіка — С.Пракоф'ева, І.Такмакова "Чыпаліна і яго сябры".

3 мая — У.Гібсан "Стваральніца цуду".

4 мая — С.Пракоф'ева, І.Такмакова "Чыпаліна і яго сябры".

5 мая — Л.Разумоўская "Сястра мая русалачка".

6 мая — Ф.Бернет "Маленькі лорд Фаунтлярой".

Беларускі палітычны тэатр аднаго акцёра "Зьніч"

30 красавіка — С.Кавалёў "Маленькі анёлак", монаспектакль паводле вершаў Кармэн Барнос дэ Гаштольд. Выканаўца — Раіса Астрадзінава.

Ул.Караткевіч "Нобіль — Барвяны ўладар", монаспектакль паводле аповесці "Сівая легенда". Выканаўца — Уладзімір Шэлестаў.

ВЫСТАВЫ

Дзяржаўны літаратурна-мемарыяльны музей Якуба Коласа сумесна з музеем беларускага Палесся запрашаюць на выставу *"К вяне б мадей хацеў вярнуцца"* (побыт гараджанінa павятовага горада канца XIX — пачатку XX стагоддзя).

Выстава працуе па адрасе: пр-т Скарыны, 66А (у двары Акадэміі навук) з 10 да 17 гадзін, выхадны — аўторак.

КІНО

Пасольства Францыі ў Рэспубліцы Беларусь і федэрацыя "Кінаклуб" *у кінатэатры "Перамога"* **прадстаўляюць рэтраспектыву "Бунтары і любовнікі".**

2, 10 мая — **"На последнем дыханіі".**

...Мишель угоняет машину в Марселе. По дороге в Париж он убивает полицейского-мотоциклиста. Разыскиваемый полицией, он находит убежище у юной американки Патриции, в которую влюблен. Во время допроса в полиции девушка вынуждена предать своего друга...

3, 11 мая — **"Жюль и Джим".**

...Париж, 1912 год. Немец Жюль и француз Джим, неразлучные друзья, оба влюбляются в Катрин, а женится на ней Жюль. Война их разлучает, но после войны друзья встречаются в Германии. Катрин несчастлива, и Жюль соглашается на то, чтобы Джим стал ее любовником...

4 мая — **"Безумный Пьеро".**

...Фердинанд встречает свою старую приятельницу Марианну и проводит с ней ночь, сбежав с официального приема. А утром в квартире находят труп...

7 мая — **"Мамочка и шлюха".**

...Александр — парижский денди — живет со своей любовницей Мари, женщиной старше его по возрасту. Однажды он знакомится с Вероникой, медсестрой. Начинается свободная жизнь втроем...

УЧЕБА В МИНСКЕ

Компьютерные курсы

Программа обучения	Примечания	Цена	Фирма	Тел.
Курсы. Начальный курс.	Windows'98, Word, Excel, E-mail, Internet – 72 часа	0,6 у.е. за час.	УП Алгоритм ПС (учебный центр) Свидетельство о регистрации № 100006883 от 28.03.2000 г. Мингорисполкомом.	258-57-60
Курсы. Применение ПЭВМ в бухгалтерии	1С бухгалтерия – 40 часов. Бухгалтерия БЭСТ – 40 часов.	0,6 у.е. за час		251-80-63
Курсы. Компьютерная графика и верстка.	CorelDraw, Adobe Photoshop, PageMaker – 148 часов, AutoCad – 72 часа	0,65 у.е. за час		258-57-60
Курсы. Техобслуживание ПЭВМ и ЛВС, базы данных, языки программирования (Java, Delphi, C++, Visual C, Visual Basic) и др.		до 1 у.е. за час		251-80-63

Тайсон вновь выходит на ринг

Экс-чемпион мира среди боксеров-профессионалов американец Майк Тайсон проведет бой с нигерийцем Дэвидом Изонритен 2 июня в Вашингтоне. Об этом сообщил менеджер "Железного Майка" Шелли Финкел, добавив, что его подопечный "пребывает сейчас в радостном возбуждении от того, что выйдет на ринг в столице США".

По словам представителей Тайсона, он сам считает предстоящую встречу с Изонритен "тренировкой" перед поединком с нынешним чемпионом мира по версиям Всемирного боксерского совета (ВБС) и Международной боксерской федерации (ИБФ) британцем Ленноксом Льюисом. Правда, еще нет ясности в окончательном решении о проведении этого боя. Переговоры зашли в тупик.

Изонритен за схватку с Тайсоном должен получить 650 тыс. долларов.

Суббота, 28 апреля

БТ

06.30 Доброе утро, Беларусь!
07.00 Новости.
07.10 Доброе утро, Беларусь!
08.00 **"Самозванцы"**. Сериал (Россия).
09.00 Новости.
09.10 **"Тайный мир Алекс Мак"**. Сериал для детей (Англия — Германия).
09.35 Здоровье. Тележурнал.
10.05 Королевская охота.
10.30 "Тишина". Док.фильм о художнике Л.Марченко ("Белвидеоцентр").
11.00 Новости.
11.15 **"Театральные истории"**. Короткометражный худ.фильм по рассказам А.П.Чехова.
12.10 Ток-шоу "Будни". Авторское право.
13.00 Новости.
13.15 **"Секретный фарватер"**. Худ.фильм (Одесская к/с). 4-я серия.
14.40 Документальный сериал "Сокровища мировой культуры" (Германия).
15.00 Новости (с сурдопереводом).
15.10 Мультфильм.
15.30 **"Тайный мир Алекс Мак"**. Сериал для детей (Англия — Германия).
16.00 "5х5". Информационно-развлекательная программа для старшеклассников.
16.55 Хоккей. Чемпионат мира. Беларусь — Чехия. Прямая трансляция. В перерывах (17.35) — Новости, (18.20) — "Зона Икс".
19.15 Детективный сериал **"Жюли Лескэ"** (Франция).
21.00 Панорама. Информационный канал.
21.45 "Тайные пружины политики". Авторская программа Юрия Азаренка.
22.05 **"Самозванцы"**. Сериал (Россия).
23.05 Спорт-курьер.
23.15 Вечерний экспресс.
23.45 Новости.
24.00 Ночной сеанс. М.Модин, Ф.Донаузй в приключенческой мелодраме **"Азарт"** (Италия).

ОРТ

06.00 Новости.
08.15 **"Воздушные замки"**. Сериал.
09.15 Поле чудес.
10.15 "С легким паром!"
10.45 История одного шедевра.
11.00 Новости.
11.15 Телеканал "Добрый день".
12.00 "След черной рыбы", 5-я серия.
13.30 Док.детектив. Тайна ракеты "Шквал". Дело Эдмонда Поупа. 2000 год.
14.00 Новости.
14.20 Приключенческий фильм **"Его звали Дьявол"**.
16.00 **"Воздушные замки"**. Сериал.
17.00 Новости.
17.25 Детектив **"Кодекс бесчестия"**.
20.00 Время.
20.40 "Ника-2001".
00.20 Новости.
00.35 Комедия **"Эд Вуд"**.

РТР

07.00, 08.00 Вести.
07.30 "Москва — Минск".
07.45 "Православный календарь".
07.50 Местное время. "Дежурная часть".
08.15 Фильм **"Ночной огонь"**.
10.00 Вести.
10.30 **"Санта-Барбара"**.
16.00 Вести.
16.30 Сериал **"Рожденная революцией. Комиссар милиции рассказывает"**.
18.00 **"Комиссар Рекс"**. Сериал.
19.00 Вести в субботу.
19.30 Местное время. Вести — Москва.
19.50 Телеигра **"Идеальный мужчина"**.
20.55 Фильм **"Все то, о чем мы так долго мечтали"**.
23.00 "По секрету...". Концерт Бориса Моисеева.
00.55 "Дежурная часть".
01.05 Чемпионат мира по автогонкам в классе "Формула-1". Гран-при Испании. Квалификация.
02.15 Прогноз погоды.

КУЛЬТУРА

09.05 "Аистенок".
09.30 "Мой цирк".
09.55 **"Лосенок"**. Худ.фильм.
11.30 Новости культуры.
11.35 Телеверсия балета "Братья Карамазовы".
12.25 Зарубежное документальное кино.
13.30 Новости культуры.
13.45 "Вместе с Фафалей".
13.55 Телеэнциклопедия.
14.10 Мультфильмы.
15.00 Новости.
15.10 **"Остров-бабочка"**. Сериал.
15.35 Играет М.Федотов.
15.55 Ж.-Б.Мольер "Мещанин во дворянстве". Спектакль.
16.45 "Малые музеи Санкт-Петербурга".
17.10 Улица моего детства.
17.30 Новости культуры.
17.40 Машины времени.
18.05 "Из концертного зала".
18.30 Отечество и судьбы.
19.10 "Вечерняя сказка".
19.20 "Веселая карусель". Мультфильмы.
19.30 Новости культуры.
19.50 "Слава труду". Док.фильм.
20.20 После новостей...
20.40 **"Европа"**. Худ.фильм.
22.30 От киноавангарда к видеоарту.
23.00 Новости культуры.

НТВ

07.00 Сегодня.
07.15 Комедия **"Трагическая ошибка"**.
09.00 Сегодня.
09.25 Сериал **"Любовь и тайны Сансет Бич"**.
10.25 Дог-шоу "Я и моя собака".
11.00 Сегодня.
11.25 Фильм **"Катенька"**.
13.00 Сегодня.
13.30 Старый телевизор.
14.40 Впрок.
15.00 Сегодня.
15.30 Фильм о фильме **"Фортуна"**.
15.55 Сериал **"Страсть"**.
16.55 Сериал **"Полицейская академия"**.
18.00 Сегодня.
18.45 "Один день".
19.20 Сериал **"Улицы разбитых фонарей-3"**.
20.30 "Итого".
21.00 Сегодня.
21.50 Тушите свет.
22.05 Фильм **"Мама"**.
00.10 Сериал **"За гранью возможного"**.

TV-6

05.00 День за днем.
05.45 Дорожный патруль.
06.00 День за днем.
08.00 Новости.
08.10 Комедия **"Как удрать из проклятого городка"**.
09.55 Телемагазин в Минске.
10.10 Сериал **"Пси-фактор III"**.
11.10 Сериал **"Женаты... С детьми..."**.
11.40 Телемагазин в Минске.
11.45 "Ох, уж эти дети!" с А.Олейниковым.
12.40 День за днем.
14.00 Новости.
14.15 День за днем.
14.55 Телемагазин в Минске.
15.20 Дорожный патруль.
15.40 Телемагазин в Минске.
16.00 Фильм **"Бледный всадник"**.
18.20 Сериал **"Вне родных квадратных метров"**.
19.00 Новости дня.
19.30 Боевик **"Замена. Последний урок"**.
21.30 Новости.
21.50 Фильм **"История вершится ночью"**.
23.40 Дорожный патруль.
23.55 ДИСК-канал.
01.00 Дорожный патруль.

СТВ+RenTV

06.00 "Икс-мен". Мультсериал.
06.30 "Шкодливый пес". Мультсериал.
07.00 "Симпсоны". Мультсериал.
07.30 Музыка на СТВ.
07.45 "Случайный свидетель".
08.30 Новости "СТВ — 24 часа".
08.45 Фантастический боевик **"Виртуальная игрушка"**.
10.35 Телемагазин.
11.05 Драма **"Вечер, поезд..."**.
13.20 "Киноафиша Минска".
13.30 "Экзотика".
13.45 "Телеспецназ".
14.00 **"Пляж"**. Сериал.
15.00 **"Игры в подкидного"**. Сериал.
16.00 "Икс-мен". Мультсериал.
16.30 "Шкодливый пес". Мультсериал.
17.00 **"Дарма и Грег"**. Сериал.
17.30 "Без косметики". Программа для женщин.
17.45 "Здравствуйте, доктор".
18.00 "Раузан". Теленовелла.
19.00 "Случайный свидетель".
19.30 Новости "СТВ — 24 часа".
19.45 "Час пик".
21.00 "Черная комната".
22.05 Фильм ужасов **"Люми"**.
00.05 Музыка на СТВ.
00.20 Драма "Вечер, поезд...".

Воскресенье, 29 апреля

БТ

